dominant within onomastic correlations, determines the conditions for granting this status to one or another member of the correlation, the relative nature of this status, as well as the influence of these parameters on the type and structure of a regional onomastic text.

**Keywords:** anthroponyms, microtoponyms, onomastic correlation, linguocultural dominant, regional onomastic text.

*УДК 811.161.3'373.23(476.5):81'373-057.4*

**Г. М. Мезенка**
*Віцебск, Беларусь*

# ПРАДАЎЖАЮЧЫ ТРАДЫЦЫІ М. В. БІРЫЛЫ: ПРАБЛЕМЫ ДАСЛЕДАВАННЯ І ЎПАРАДКАВАННЯ АНТРАПАНІМІІ БЕЛАРУСКАГА ПААЗЕР'Я

В статье проводится обзор направлений антропонимических исследований ученых витебской ономастической школы, продолжающих традиции известного белорусского лингвиста Н. В. Бирилло, 100-летний юбилей которого приходится на 10 сентября 2023 г. Анализ идей и научного наследия Н. В. Бирилло в контексте проблем современной антропонимики выявляет жизненность и актуальный характер трудов ученого. В статье рассмотрены ключевые вопросы региональной антропонимики, которым посвящены научные исследования витебских ученых.

**Ключевые слова:** антропонимикон, Белорусское Поозерье, личное имя, ономастика, ономастическая школа, прозвище, региональная антропонимия, фамилия.

Кола навуковых інтарэсаў вядомага беларускага лінгвіста М. В. Бірылы (100-гадовы юбілей прыпадае на 10 верасня 2023 г.), якога заўсёды прыцягвала ўсё новае, нязведанае ў мовазнаўстве, важныя для развіцця навукі напрамкі, пачынаючы з 1960-х гг. пашырылася за кошт анамастычнай праблематыкі. Яго даследаванні беларускіх імёнаў, мянушак і прозвішчаў [2; 4–6] склалі падмурак новай для таго перыяду галіны беларускай лінгвістыкі – анамастыкі. Зацікаўленая і плённая праца ў гэтай галіне дазволіла Мікалаю Васільевічу стварыць беларускую анамастычную школу і вывесці яе на міжнародны ўзровень.

Многія з праблем, пастаўленых вучоным, застаюцца сугучнымі сучасным падыходам да вывучэння імёнаў і прозвішчаў.

Мэта дадзенага артыкула – прадставіць развіццё даследаванняў сістэмы ўласных імёнаў у адным з рэгіёнаў краіны – Беларускім Паазер'і.

Сістэматычныя даследаванні антрапаніміі аднаго з шасці гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі, які праз багацце азёр на яго тэрыторыі атрымаў назву Беларускага Паазер'я, маюць пакуль не вельмі багатую гісторыю. Яна пачалася напярэдадні мілёніума і першапачаткова была накіравана на вывучэнне паходжання, структуры і семантыкі прозвішчаў жыхароў Віцебшчыны ў рамках арэальнага, параўнальна-супастаўляльнага, параўнальна-гістарычнага аналізу. Першае даследаванне, цалкам прысвечанае прозвішчам, што бытуюць на тэрыторыі Беларускага Паазер'я, было апублікавана ў 1999 г. Аўтарам артыкула «Прозвішчныя тыпы Віцебшчыны: паміж усходам і захадам» [21], выдадзенага ў «Весніку Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта», была Г. К. Семянькова.

Пачатак антрапанімічных даследаванняў на Віцебшчыне адзначыўся сінхронна-дыяхронным падыходам да вывучэння прозвішчаў жыхароў рэгіёна з мэтай: а) вызначыць прадуктыўнасць розных прозвішчных тыпаў; б) апісаць прозвішчаўтваральныя асновы ў тэрмінах семантычнага поля, устанавіць адметнасць ядзерна-перыферыйных адносін паміж элементамі; в) вызначыць асаблівасці размяшчэння розных па семантыцы прозвішчаўтваральных асноў і па структуры антрапанімных адзінак на тэрыторыі Віцебскай вобласці; г) устанавіць спецыфічнасць прозвішчаў жыхароў рэгіёна ў семантычным, структурным і лінгвагеаграфічным планах [22]. Цікавасць даследчыцы да прозвішчаў жыхароў паўночнай тэрыторыі Беларусі стала своеасаблівым штуршком да вывучэння іншых тыпаў антрапонімаў.

Недастатковая вывучанасць рэгіянальнай гістарычнай антрапаніміі на фоне вывучэння функцыянавання беларускай мовы XVI–XVIII стст. паставіла пытанне аб неабходнасці старанна

і дбайна прамаляваць асаблівасці называння жыхароў на абмежаванай тэрыторыі, у прыватнасці, Віцебшчыне і Магілёўшчыне XVI–XVIII стст., і адначасова выявіць характэрныя рысы агульнабеларускай сістэмы называння, што мае пэўнае значэнне для канкрэтызацыі і паглыблення існуючых звестак аб фарміраванні сучаснай афіцыйнай антрапанімнай формулы ідэнтыфікацыі асобы.

Пералічанае і стала прадметам даследавання В. М. Ляшкевіч [10], у якім аўтар упершыню ў межах беларускай антрапаніміі прадставіла антрапанімную сістэму раней не даследаванага рэгіёна Беларусі на працягу трох стагоддзяў яе функцыянавання; выявіла заканамернасці словаўтварэння і функцыянавання мужчынскіх і жаночых каляндарных імёнаў; разгледзела пытанне фанетычнай і марфалагічнай адаптацыі ўласных асабовых імёнаў на даследаванай тэрыторыі, вызначыла асаблівасці ўжывання і фарміравання імёнаў па бацьку; устанавіла спосабы ўтварэння і структурныя асаблівасці разгорнутых найменняў асоб мужчынскага і жаночага полу; паказала ўплыў сацыялінгвістычных, культурных і іншых фактараў на характар імёнаў-мянушак.

Праведзенае В. М. Ляшкевіч даследаванне дазволіла прыйсці да наступных высноў. Па-першае, функцыянаванне антрапонімаў у афіцыйна-дзелавой мове вызначаецца характарам і жанрам помнікаў мясцовай дзелавой пісьменнасці, знешнімі ўмовамі афармлення дакумента, мясцовымі традыцыямі складання помніка, суб’ектыўнымі фактарамі.

Па-другое, антрапонімы Віцебшчыны і Магілёўшчыны XVI–XVIII стст. з’яўляюцца неад’емнай часткай лексічнай сістэмы мовы і ўтвараюць своеасаблівую падсістэму з уласцівымі спецыфічнымі сродкамі, заканамернасцямі змянення, функцыянавання і распаўсюджання.

Па-трэцяе, з сярэдзіны XVIII ст. унутрысямейныя імёны значна саступаюць свае пазіцыі кананічным, а агульнабытавыя імёны-мянушкі працягваюць існаваць у якасці другога і / або трэцяга імені.

Па-чацвёртае, у даследаваны перыяд актыўна фарміруецца імя па бацьку як афіцыйная антрапанімная адзінка ў складзе наймення асобы, складаецца ўстойлівая мадэль найменняў з кампанентам тыпу сучасных прозвішчаў.

У першым дзесяцігоддзі XXI ст. адзначаны прыкметныя інавацыі ў выглядзе спроб пераводу меж лінгвістычнай структурнай парадыгмы на рэйкі антрапацэнтрычнага падыходу, які дамінуе ў сучаснай лінгвістыцы і выяўляецца ў павышанай увазе да рознабаковай праявы чалавека ў мове, вызначаецца накіраванасцю працэсу, пры якім адбываецца мадэляванне характару ўзаемадзеяння моўнай і пазамоўнай інфармацыі ў плане зместу ўласных імёнаў. Сістэмна-структурная, статыстычная парадыгма гуманітарных ведаў адыходзіць, а прыходзіць парадыгма функцыянальная, кагнітыўная і дынамічная.

З улікам гэтага пабудавана наступнае навуковае даследаванне Г. М. Дзеравягі («Анамастычная прастора паэзіі XX стагоддзя: семантыка оніма, функцыянальны патэнцыял» [8]), прысвечанае праблемам літаратурнай антрапанімікі як сферы ўзаемадзеяння мовазнаўства і літаратуразнаўства, што суадносіцца з імкненнем сучаснай лінгвістычнай навукі да аналізу моўных фактаў у аспекце сувязей паміж рознымі навуковымі дысцыплінамі. Цікавілі Г. М. Дзеравягу асаблівасці семантычнай валентнасці элементаў антрапанімнага і тапанімнага субпалёў, кола рэалізацый, якое складае функцыянальны патэнцыял анімнай лексікі ў паэтычным тэксце XX ст., а таксама дынаміка значэння антрапанімных і тапанімных адзінак пры іх ужыванні па-за першаснай функцыяй ідэнтыфікацыі рэферэнта.

Пастаўленая даследчыцай мэта – выявіць мадэлі анамастычнай прасторы паэзіі XX ст. і вызначыць тое, як маніфестуецца семантычная валентнасць і што складае спектр функцыянальных рэалізацый анімічных адзінак антрапанімнага і тапанімнага субпалёў анамастычнага поля ў паэтычным тэксце – дазволіла ўстанавіць асноўныя тыпы паэтонімаў, якія ўдзельнічаюць у стварэнні лірычных вобразаў элітарнай паэзіі XX ст.; вызначыць уплыў кампанентаў структуры онімаў і паэтычнага тэксту на фарміраванне ўнутранай формы і стылістычнай афарбаванасці паэтонімаў, а таксама разгледзець механізм дынамікі значэння паэтонімаў у сувязі з іх роляй у фарміраванні тэксту паэзіі; выявіць асобныя паэтонімныя падсістэмы і спецыфіку іх функцыянавання.

2010-м годам датуецца спроба пераводу ў антрапанімічнае мысленне сацыялінгвістычных і прагматычных ідэй, што пашырыла напрамкі развіцця беларускай антрапанімікі пры захаванні распрацаваных раней метадаў даследавання. Абумоўленае патрабаваннямі развіцця ўсходнеславянскай лінгвістыкі і анамастыкі ў сувязі з адсутнасцю комплексных работ, якія раскрываюць дынаміку антрапанімнай прасторы беларускага горада на сучасным этапе ў яе залежнасці ад грамадска-палітычных і культурных рэалій, задачамі агульнатэарэтычнага і прыкладнога характару, а менавіта неабходнасцю вырашэння шэрага надзённых праблем адміністрацыйна-юрыдычнай практыкі (упарадкаванне спосабаў ідэнтыфікацыі насельніцтва шляхам дыферэнцыяцыі самастойных імёнаў і іх варыянтаў), тэорыі маўленчай дзейнасці (раскрыццё камунікатыўна-прагматычнага патэнцыялу антрапонімаў), дэскрыптыўнай і прыкладной анамастыкі (вызначэнне ўзроўню анамастыка-этымалагічнай кампетэнцыі індывідаў, апісанне існасных характарыстык працэсаў рэнамінацыі, надання імені блізнятам і інш.) на пачатку другога дзесяцігоддзя XXI ст. наспела і стала патрабаваннем часу даследаванне Т. У. Скрабнёвай «Антрапанімікон сучаснага беларускага горада ў дынамічным і сацыялінгвістычным аспектах (на матэрыяле рускамоўных асабовых імёнаў г. Віцебска)» [23].

Зрабіўшы прадметам свайго даследавання асаблівасці развіцця і функцыянавання іменніка гараджан у 2-й палове XX ст., антрапанімічныя і сацыяльна-гістарычныя працэсы, што ўплываюць на яго дынаміку, аўтар здолела вызначыць спецыфіку змены асабовага імені, высветліць асаблівасці называння блізнят, устанавіць антрапанімныя варыянты, якія выкарыстоўваюцца ў афіцыйнай сферы, вызначыць іх прадуктыўнасць, рэгіянальную своеасаблівасць, адзначыць спецыфіку антрапанімікону сучаснага беларускага горада ў параўнанні з сельскім, устанавіць узровень анамастыка-этымалагічнай кампетэнцыі гараджан – іншымі словамі, вырашыць пытанні, якія М. В. Бірылам у 1960–80-я гг. яшчэ не ставіліся.

Адну з задач антрапанімікі вучоныя бачаць у фарміраванні ўяўлення аб развіцці агульнанацыянальнай сістэмы наймення. Вынікі даследаванняў імёнаў некаторых гарадоў Беларусі, найперш Віцебска, Гомеля, Гродна, Полацка і інш., даказваюць, што практычна на ўсіх тэрыторыях краіны назіраюцца мясцовыя асаблівасці. Пры гэтым апісаць сучасны стан беларускай антрапаніміі магчыма толькі пры ўмове вывучэння ўсіх рэгіянальных іменаслоўных падсістэм краіны. Як мы ўжо адзначалі, аналіз якаснага і колькаснага бакоў нацыянальнага беларускага антрапанімікону становіцца «актуальнай навуковай задачай, якая патрабуе своечасовага і дасканалага рашэння» [1, с. 8].

У Беларусі з-за яе геаграфічнага становішча і суседства з іншымі краінамі праблема памежжа набывае адну з вядучых роляў. Агульнабеларускія фактары наймення індывіда дакладна і выразна выяўляюцца ў канкрэтным рэгіёне. Віцебшчына – адзін з рэгіёнаў Беларусі, і разам з тым гэта асаблівая тэрыторыя, памежная з Расіяй, якая складае разам з ёй своеасаблівую адзіную ўсходнеславянскую прастору. Даследуючы іменнікі памежных рэгіёнаў, можна зрабіць як агульныя, так і прыватныя назіранні, якія дапамагаюць разгледзець анамастычную сістэму ў параўнальна-супастаўляльным плане, зрабіць высновы аб існуючых сістэмах ідэнтыфікацыі чалавека ў соцыуме.

Моўныя кантакты на стыкавых тэрыторыях актыўна абмяркоўваюцца ў навуковым асяроддзі, аднак антрапанімічны напрамак у вывучэнні прыгранічных рэгіёнаў толькі пачынае складвацца. Да ліку даследчыкаў, якія пачалі зважаць на пытанні тэрытарыяльнай дыферэнцыяцыі іменнікоў беларускага памежжа, трэба аднесці Ю. М. Галкоўскую. У артыкулах і дысертацыйным даследаванні аўтара ўпершыню вывучаны імяннік беларускага памежжа ў арэальным аспекце. Ёю выяўлена спецыфіка антрапаніміі беларуска-літоўска-латышскага і беларуска-расійскага памежных арэалаў, устаноўлены этнічна маркіраваныя найменні, намінатары ў памежжы; выяўлена спецыфіка нацыянальна-культурнай прасторы памежжа, увасобленая ў рэгіянальнай антрапаніміі. Удалося паказаць ролю імені ўласнага як сацыякультурнага феномена і ідэнтыфікатара чалавека ў соцыуме з улікам нацыянальнай спецыфікі і гістарычнага фактару, вызначыць матывы выбару імёнаў; супаставіць намінатыўныя прыярытэты жыхароў памежжа; прааналізаваць традыцыйныя і новыя антрапанімныя рэсурсы; устанавіць асаблівасці антрапанімічнага памежжа [7]. Усё гэта дало магчымасць выявіць на анамастычным і культуралагічным узроўнях механізм узаемадзеяння моў і асаблівасці механізму ідэнтыфікацыі індывіда ў соцыуме.

Паколькі формы імёнаў выкарыстоўваюцца з улікам лінгвістычнага і эстэтычнага густу камунікантаў, сучасныя намінацыйныя тэндэнцыі знаходзяць адлюстраванне таксама ў неафіцыйнай антрапаніміі. У шырокім коле класічных і сучасных работ па антрапаніміцы асобнае месца набываюць праблемы рэгіянальных неафіцыйных імёнаў.

Першым з беларускіх анамастаў у 1960–80-я гг. звярнуў увагу на стан неафіцыйнага антрапанімікону М. В. Бірыла [3]. Пра функцыянаванне неафіцыйных імёнаў у дыяхраніі пісалі В. М. Ляшкевіч [10], М. Д. Путрова [20]. Аднак сістэмнае даследаванне, прысвечанае неафіцыйнай намінацыі ва ўзаемасувязі са спецыфікай камунікатыўнага асяроддзя, пачалося з артыкулаў і абароны кандыдацкай дысертацыі І. А. Лісавай [9].

Пашырэнне метадалагічнага інструментарыя антрапанімікі ў русле міждысцыплінарных даследаванняў паступова набывае рысы пастаяннага даследчага поля. Усё часцей робіцца спроба выкарыстоўваць розныя даследчыя напрамкі і метадалогіі для апісання асабовых імёнаў, сярод якіх элементы кагнітыўнай лінгвістыкі, лінгвакультуралогіі, статыстычнай лінгвістыкі і канцэпцыі моўнай карціны свету. Асабовае імя разглядаецца як вынік розных моўных, культурных, сацыяльных і гістарычных працэсаў.

У працяг пачатага М. В. Бірылам аналізу неафіцыйных форм імёнаў І. А. Лісава ўпершыню ўводзіць паняцце «неафіцыйны антрапанімны спектр» і вызначае асноўныя параметры яго фарміравання. Даследчыцай устанаўліваюцца групы неафіцыйных форм імёнаў жыхароў Беларускага Паазер'я рознай ступені ацэнкі; вызначаюцца дыферэнцыяльныя і інтэгральныя зоны функцыянальных парадыгмаў парных імёнаў. Важна, што аўтар выяўляе псіхалінгвістычныя дэтэрмінанты фарміравання неафіцыйнага іменніка, а таксама рэпрэзентатыўныя і перлакутыўныя асаблівасці функцыянавання форм асабовых імёнаў насельніцтва; устанаўлівае матыватары міжмоўнай і ўнутрымоўнай канвергенцыі рэгіянальнай неафіцыйнай антрапаніміі. Акрамя таго, І. А. Лісава распрацоўвае падыход да ўжывання картаграфічнага метаду даследавання пры вызначэнні спецыфікі функцыянавання неафіцыйных імёнаў у рэгіёне. У выніку аўтару ўдалося выявіць сацыя- і псіхалінгвістычныя, прагматычныя, этнакультурныя і занальныя асаблівасці неафіцыйнага антрапанімікону жыхароў Беларускага Паазер'я.

Праблематыка антрапанімічных даследаванняў паўночнага рэгіёна краіны паступова пашыралася. Праца ў гэтым напрамку працягнута таксама намі. Серыя артыкулаў прысвечана праблеме фарміравання формул і асноўных кірункаў сямейнага называння жыхароў Віцебска [17, 18], уплыву на іх культурна-рэлігійных традыцый [13, 16, 19], вызначэнню месца прозвішчаў віцяблян у агульнаславянскім антрапаніміконе [11, 15].

Сучасны стан і гістарычнае фарміраванне розных формул іменавання жыхароў Віцебшчыны XVI–XXI стст. сталі прадметам даследавання ў калектыўнай манаграфіі Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч і Г. К. Семяньковай «Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць» [12].

Камунікатыўна-прагматычны патэнцыял антрапонімаў, асаблівасці працэсу рэнамінацыі, надання імені блізнятам, тыпалогія і сувязі прозвішчных іменаванняў з найважнейшымі кодамі культуры знайшлі адлюстраванне ў манаграфіі Г. М. Мезенка і Т. У. Скрабнёвай «Антрапанімная прастора Віцебшчыны» [14].

Такім чынам, сучасны перыяд развіцця антрапанімікі, які прадаўжае традыцыі М. В. Бірылы, характарызуецца пашырэннем праблемнага поля, узрастаннем цікавасці да вызначэння месца іменавання жыхароў рэгіёна ў антрапаніміконе Славіі, сувязі з культурна-гістарычным і нацыянальна-спецыфічным кантэкстам вызначанага часу, рэалізацыі звестак аб чалавеку і яго навакольным асяроддзі.

## Літаратура

1. Беларуская антрапанімія : вучэб. дапам. / Г. М. Мезенка (навук. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2009. – 254 с.

2. Бірыла, М. В. Беларускія антрапанімічныя назвы ў іх адносінах да антрапанімічных назваў іншых славянскіх моў (рускай, украінскай, польскай) / М. В. Бірыла. – Мінск : Выд-ва Акад. навук БССР, 1963. – 58 с.

3. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія. 1. Уласныя імёны, імёны-мянушкі, імёны па бацьку, прозвішчы / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 329 с.

4. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія. 2. Прозвішчы, утвораныя ад апелятыўнай лексікі / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1969. – 508 с.

5. Бірыла, М. В. Беларуская антрапанімія. 3. Структура ўласных мужчынскіх імён / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1982. – 320 с.

6. Бірыла, М. В. Тыпалогія і геаграфія славянскіх прозвішчаў. Даклады X Міжнароднага з'езда славістаў / М. В. Бірыла. – Мінск : Навука і тэхніка, 1988. – 63 с.

7. Галковская, Ю. М. Именник белорусского приграничья: территориальная дифференциация (на материале русскоязычных личных имен жителей Витебщины) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / Ю. М. Галковская ; Центр исслед. белорус. культуры, языка и литературы. – Минск, 2014. – 24 с.

8. Деревяго, А. Н. Ономастическое пространство поэзии XX века: семантика онима, функциональный потенциал : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / А. Н. Деревяго ; Ин-т языкозн. имени Якуба Коласа. – Минск, 2005. – 21 с.

9. Лисова, И. А. Неофициальная антропонимия Белорусского Поозерья: полиаспектный подход : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / И. А. Лисова ; Центр исслед. белорус. культуры, языка и литературы. – Минск, 2014. – 24 с.

10. Ляшкевіч, В. М. Антрапанімная сістэма Віцебшчыны і Магілёўшчыны XVI–XVIII стст. (на матэрыяле мясцовай дзелавой пісьменнасці) : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / В. М. Ляшкевіч ; Ін-т мовазн. імя Якуба Коласа. – Мінск, 2004. – 21 с.

11. Мезенка, Г. Віцебскія прозвішчныя тыпы XVII–XIX стст. у славянскім кантэксце / Г. Мезенка // Беларуская мова: шляхі развіцця, кантакты, перспектывы : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2001 г.) / рэдкал.: Г. Цыхун (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2001. – С. 73–84.

12. Мезенка, Г. М. Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць / Г. М. Мезенка, В. М. Ляшкевіч, Г. К. Семянькова. – Віцебск : Выд-ва УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2006. – 238 с.

13. Мезенка, Г. М. Лікавыя прозвішчы і сімволіка духоўнай культуры народа / Г. М. Мезенка // Новае слова ў мовазнаўстве : матэрыялы V Міжнар. кангрэса беларусістаў «Новае слова ў беларусістыцы» (20–21 мая 2010 г.) / пад рэд. С. М. Запрудскага, Г. А. Цыхуна. – Мінск, 2012. – С. 113–120.

14. Мезенко, А. М. Антропонимное пространство Витебщины / А. М. Мезенко, Т. В. Скребнева. – Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2013. – 148 с.

15. Мезенко, А. М. Витебский антропонимикон XVII–XIX вв. в контексте славянских антропонимных традиций / А. М. Мезенко // Беларуска-руска-польскае супастаўляльнае мовазнаўства : дакл. V Міжнар. навук. канф., Віцебск, 25–27 мая 2000 г. – Віцебск, 2000. – С. 89–100.

16. Мезенко, А. М. Время и религия в антропонимиконе Витебска XVII–XIX вв. / А. М. Мезенко // Белорусское Поозерье: язык и духовная культура / под ред. А. М. Мезенко, А. В. Русецкого. – Минск, 2001. – С. 43–65.

17. Мезенко, А. М. Женский городской антропонимикон 2-й половины XX в.: динамика, тенденции развития / А. М. Мезенко // Ученые записки УО «ВГУ им. П. М. Машерова». – 2010. – Т. 9. – С. 28–35.

18. Мезенко, А. М. Мотивы выбора имен у россиян и белорусов: общее и специфическое / А. М. Мезенко // Изв. Гомельского гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2010. – № 3 (59). – С. 165–168.

19. Мезенко, А. М. Фитофорные фамилии и культура славян / А. М. Мезенко // Λογος όνομαστική. – 2013. – № 5. – С. 13–17.

20. Путрова, М. Д. Гендарныя асаблівасці ўжывання імя ўласнага / М. Д. Путрова // Вестн. МГЛУ. Сер. 1. Филология. – 2007. – № 4 (29). – С. 187–196.

21. Семянькова, Г. К. Прозвішчныя тыпы Віцебшчыны: паміж усходам і захадам / Г. К. Семянькова // Веснік Віцебскага дзярж. ун-та. – 1999. – № 4 (14). – С. 48–53.

22. Семянькова, Г. К. Прозвішчы жыхароў Віцебшчыны: структура, семантыка, геаграфія : аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук : 10.02.01 / Г. К. Семянькова ; Бел. дзярж. пед. ун-т імя Максіма Танка. – Мінск, 2002. – 21 с.

23. Скребнева, Т. В. Антропонимикон современного белорусского города в динамическом и социолингвистическом аспектах (на материале русскоязычных личных имен г. Витебска) : автореф. дис. ... канд. филол. наук : 10.02.02 / Т. В. Скребнева ; Бел. гос. ун-т. – Минск, 2010. – 23 с.

**H. M. Mezenka**

## CONTINUING THE TRADITIONS OF M. V. BIRYLA: PROBLEMS OF RESEARCH AND ORDERING OF THE ANTHROPONYMY OF THE BELARUSIAN PAAZIERJE

The article is dedicated to the review of directions of anthroponymic research performed by scientists of Vitebsk onomastic school keeping up the traditions of the famous Belarusian linguist M. V. Biryla, whose 100th anniversary falls on September 10, 2023. Analysis of the ideas and scientific heritage of M. V. Biryla in the context of the problems of contemporary anthroponymy testifies to the liveliness and actuality of the scientist's works. The article examines key issues of regional anthroponymy to which the scientific research of Vitebsk scientists is dedicated.

**Keywords:** anthroponymicon, Belarusian Paazierje, personal name, onomastics, onomastics school, nickname, regional anthroponymy, surname.